ТРАВЕНЬ - ЖНІВЕНЬ 2026
TRENDS.BELHELCOM.ORG

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ ТРЭНДЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ | ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА | КЛЮЧАВЫЯ РЭАКЦЫІ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

Беларускія ўлады прызналі БХК і шэраг іншых праваабарончых арганізацый так званымі «экстрэмісцкімі фармаваннямі».

Захоўванне і распаўсюджванне матэрыялаў арганізацыі стварае рызыкі для людзей, якія знаходзяцца ў Беларусі або плануюць паездку ў краіну.

Калі ласка, улічвайце гэта пры абыходжанні з дадзеным матэрыялам.

Агляды «Правы чалавека ў Беларусі: асноўныя трэнды дзяржаўнай палітыкі» выходзяць пры падтрымцы Еўрапейскага саюза і Konrad-Adenauer-Stiftung Belarus.
Змест аглядаў адлюстроўвае выключна погляды і меркаванні аўтараў і не абавязкова супадае з поглядамі або афіцыйнымі пазіцыямі Еўрапейскага саюза ці Фонду Конрада Адэнаўэра. Усю адказнасць за змест нясуць аўтары.

Co-funded by the European Union

KONRAD ADENAUER STIFTUNG BELARUS

© Беларускі Хельсінкскі Камітэт, 2026

# ЗМЕСТ


**УВОДЗІНЫ** 4

**РЭЗЮМЭ** 6

**I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДПАСЫЛКІ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ** 10

Пашырэнне легалізацыі сістэмных рэпрэсій 10

- Узмацненне кантролю за супрацоўнікамі сілавых ведамстваў і дыпламатамі 10
- Узмацненне кантролю за свабодай перамяшчэння грамадзян праз абмежаванне доступу да інфармацыі 12
- Узмацненне кантролю за грамадзянскай супольнасцю 13

Ціск у сферы адукацыі 15

- Узмацненне ідэалагічнага кантролю за індывідуальнай адукацыйнай дзейнасцю (нефармальная адукацыя) 15
- Пашырэнне паўнамоцтваў па правядзенні агляду непаўналетніх ва ўстановах адукацыі 16

Пашырэнне магчымасцяў адвольнага доступу дзяржавы да персанальных даных / умяшанне ў прыватнае жыццё 17

- Пашырэнне пераліку даных, якія кліент абавязаны прадаставіць банку: геалакацыя цяпер абавязковая 18
- Анансаваны закон аб абавязковай рэгістрацыі ДНК 19

Сацыяльныя і эканамічныя правы: абмежаванні ў сферы пенсійнага забеспячэння як частка рэпрэсіўнай палітыкі 20

**II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ** 22

Масавы пераслед за сувязі з ЕГУ 22

«Схаваныя рэпрэсіі» 23

Новыя практыкі пераследу 23

# УВОДЗІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі застаецца прадметам маніторынгу і аналізу з боку беларускіх і міжнародных НДА і міжнародных арганізацый. З 2012 г. дзейнічае мандат Спецыяльнага дакладчыка па сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Таксама агляды падаюцца ў рамках альтэрнатыўных дакладаў грамадзянскай супольнасці ў дамоўныя органы, якія кантралююць выкананне асноўных канвенцый ААН у галіне правоў чалавека, а таксама ў дакладах саміх гэтых органаў. У сувязі з неабгрунтаваным ужываннем сілы, катаваннямі ў дачыненні да мірных пратэстоўцаў супраць сфальсіфікаваных выбараў у 2020 г. і распачатымі за імі рэпрэсіямі, у сакавіку 2021 г. быў заснаваны спецыяльны Мандат па сітуацыі ў Беларусі пад эгідай Вярхоўнага камісара ААН, які ў 2024 г. быў заменены групай незалежных экспертаў, што азначае большую самастойнасць і незалежнасць гэтага механізму.

З 2019 г. БХК разлічвае Нацыянальны індэкс па правах чалавека, у межах якога больш за 40 беларускіх экспертаў:к ацэньваюць змены асобна па кожным пункце каталога правоў чалавека. Беларускія НДА рэгулярна робяць профільныя маніторынгі сітуацыі з правамі чалавека, выходзячы са сваёй спецыялізацыі.[1]

Спачатку падзеі 2020 года, пазней вайна ва Украіне і суўдзел Беларусі ў расійскай агрэсіі істотна змянілі становішча ў краіне, у тым ліку палітыку і практыку ў сферы правоў чалавека. Сітуацыя ўвесь час пагаршаецца: штодня становіцца вядома аб зменах заканадаўства, ініцыятывах уладаў,[2] канкрэтных парушэннях і г.д. У гэтым патоку інфармацыі **складана ўтрымаць фокус увагі**, размываецца мяжа паміж галоўным і негалоўным.

Каб не прапусціць найбольш значныя падзеі, лепш разумець сітуацыю ў Беларусі, і куды рухаецца дзяржава ў кантэксце вяршэнства права і правоў чалавека, мы адсочваем **найбольш значныя і якасныя змены асноўных трэндаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы правоў чалавека**.

Для гэтага з ліпеня 2023 года Беларускі Хельсінкскі Камітэт выпускае перыядычны агляд. Яго мэта - прадстаўляць нашыя экспертныя ацэнкі **найбольш значных і якасных змен у тэндэнцыях беларускай дзяржаўнай палітыкі** ў галіне правоў чалавека і рэакцыях на яе міжнароднай супольнасці за справаздачны перыяд па трох напрамках:

---

1 *Гл., у прыватнасці, Аналітычныя агляды сітуацыі з правамі чалавека, якія рыхтуе ПЦ «Вясна»: https://spring96.org/ru/publications; Агляды сітуацыі са свабодай асацыяцый і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, якія робіць Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/ezhegodnyj-monitoring; маніторынгі і Электронныя бюлетэні СМІ ў Беларусі, якія робіць БАЖ: https://baj.media/ru/aglyady_category/monitoringi-bazh/ і інш*

2 *Мы маем на ўвазе, што цяперашнія ўлады ў Беларусі з'яўляюцца ўладамі дэ-факта.*

- *агульныя меры:* сістэмныя рэчы - заканадаўства, стратэгіі, палітыкі, якія ў цэлым вызначаюць умовы і перадумовы рэалізацыі правоў чалавека ў краіне;
- *праваапрымяняльная практыка:* тэндэнцыі парушэнняў грамадзянскіх і палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў;
- *ключавыя рашэнні і рэакцыі міжнародных структур,* звязаныя з сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

Нашая аналітыка дапамагае лепш зразумець трэнды ў галіне правоў чалавека ў Беларусі (для міжнародных партнёраў - у прынцыпе лепш арыентавацца ў беларускім парадку дня), дае магчымасць адсочваць сістэмныя і якасныя змены сітуацыі, пашыраць правачалавечны фокус аналітыкі ў сумежных галінах (палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і інш.), будзе карысная для выпрацоўкі стратэгій і пазіцый.

Агляд выходзіць з 2023 г. У 2023 г. - 2 выпускі (за кожнае паўгоддзе), у 2024 і 2025 гг. - раз у трыместр (па выніках кожных 4-х месяцаў). Папярэднія выпускі і зводную аналітыку за кожны год можна знайсці тут.

**Вы можаце падпісацца на наш агляд тут**

ПАДПІШЫЦЕСЯ НА НАСТУПНЫ
ВЫПУСК ТРЭНДАЎ НА

TRENDS.BELHELCOM.ORG

# РЭЗЮМЕ

- Агульны і вельмі яскравы трэнд мая–жніўня 2026 г. на ўзроўні дзяржаўнай палітыкі: **узмацненне кантролю, у тым ліку з мэтай фармалізацыі ўсё большай колькасці пазасудовых інструментаў рэпрэсій**. Нягледзячы на і так жорсткія меры ідэалагічнага і іншага кантролю, істотна фармалізаваныя за апошнія 5 гадоў, за справаздачны перыяд дзяржава прыняла (або азвучыла намер прыняць) цэлы набор новых кантрольных мер:

  - меры ідэалагічнага кантролю за сілавікамі і дыпламатамі, арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, у сферы нефармальнай адукацыі (рэпетытары);
  - кантроль за свабодай перамяшчэння грамадзян;
  - адміністрацыйны кантроль ва ўстановах сярэдняй адукацыі / сек'юрытызацыя адукацыйнага асяроддзя (кантроль за непаўналетнімі);
  - ідэнтыфікацыйны і біяметрычны кантроль;
  - лічбавы кантроль;

- Прыняты новы Указ прэзідэнта № 230 «Аб пытаннях праходжання ваеннай службы, службы ў ваенізаваных арганізацыях». Па-першае, ён замацоўвае неправавы пазасудовы механізм паслужбовага кантролю і патэнцыяльнага выключэння чалавека з пэўнага сегмента прафесійнага жыцця — гэта значыць фармалізуе парушэнне права на працу і чарговыя дыскрымінацыйныя палажэнні. Па-другое, надзяляе ваенізаваныя арганізацыі і МЗС новымі, не ўласцівымі ім кантрольнымі паўнамоцтвамі — наглядаць за выкананнем пакарання.

  Працаўладкаванне шасці катэгорый службовых асоб, звольненых «па дыскрэдытуючых абставінах», на працягу 5 гадоў будзе кантралявацца з мэтай не дапусціць іх на кіруючыя пасады не толькі ў дзяржаўных, але і ў прыватных арганізацыях. Гэта датычыцца ваеннаслужачых, супрацоўнікаў органаў фінансавых расследаванняў КДК, Следчага камітэта, органаў унутраных спраў, органаў па надзвычайных сітуацыях і дыпламатаў. Ні сам шырокі і ацэначны пералік «дыскрэдытуючых абставін», ні 5-гадовы тэрмін кантролю, ні распаўсюджванне нормы на прыватны сектар не маюць разумнага прававога абгрунтавання і ўяўляюць сабой дадатковы рэпрэсіўны пазасудовы інструмент.

- Законныя формы і прастора дзейнасці грамадзянскай супольнасці і самаарганізацыі практычна цалкам пераходзяць пад дзяржаўны кантроль. Кожны новы прававы акт у гэтай сферы максімальна звужае магчымасць легальнага існавання арганізацый грамадзянскай супольнасці, якія не з'яўляюцца цалкам лаяльнымі да дзяржавы. Прыняты новыя правілы рэгістрацыі прыватных устаноў і асацыяцый (уласнікі ўстановы і чальцы асацыяцыі цяпер мусяць праходзіць узгадненне з КДБ); асобная нарматыўная рамка (асобны закон) рыхтуецца ў дачыненні да валанцёрства; рыхтуюцца змены ў рэгуляванне прафсаюзаў.

- Дзве меры, прынятыя ў сферы адукацыі — стварэнне рэестра рэпетытараў і прыватных педагогаў і пашырэнне паўнамоцтваў па правядзенні агляду непаўналетніх ва ўстановах адукацыі без прысутнасці бацькоў — працягваюць паслядоўны рух дзяржавы да манапалізацыі сферы адукацыі і ўзмацнення кантролю над дзецьмі. Пры фармальным прыкрыцці рыторыкай абароны непаўналетніх абедзве меры ў сукупнасці дэманструюць не столькі клопат аб бяспецы і дабрабыце дзяцей, колькі выбудоўванне інструментаў дысцыплінарнага і ідэалагічнага кантролю як над дарослымі, якія працуюць з дзецьмі, так і над самімі дзецьмі.

- Дзяржава працягвае прымаць новыя меры для абмежавання доступу да лічбавых паслуг (насуперак задэклараванаму трэнду на лічбавізацыю). Зменены парадак прадастаўлення звестак з банка даных аб грамадзянах, якім часова абмежавалі выезд з Беларусі. Калі раней такія звесткі можна было атрымаць праз асабісты кабінет у сістэме МУС, то цяпер яны прадастаўляюцца толькі асабіста — грамадзяніну або яго законнаму прадстаўніку. Па-першае, гэта чарговы выпадак закрыцця доступу да інфармацыі, важнай у кантэксце рэпрэсій (гэтак жа, як і закрыццё ў 2025 г. доступу да онлайн-расклада судовых паседжанняў). Па-другое, гэтая мера зніжае даступнасць і аператыўнасць атрымання чалавекам інфармацыі аб тым, ці падпадае ён пад забарону на выезд, стварае дадатковую рызыку ў рэпрэсіўным кантэксце і можа стрымліваць людзей ад высвятлення свайго статусу і планавання бяспечных дзеянняў. Па-трэцяе, гэта таксама форма трансгранічных рэпрэсій, паколькі вымушана з'ехаўшыя або прымусова вывезеныя людзі не могуць атрымаць інфармацыю аб сваім статусе (гл., напрыклад, сітуацыю вывезенага ў снежні 2025 г. праваабаронцы Уладзіміра Лабковіча).

- Пашыраецца легалізацыя выкарыстання розных сістэм ідэнтыфікацыі і адсочвання чалавека: ад біяметрычных і генетычных ідэнтыфікатараў да

лічбавых даных аб гаджэтах і месцазнаходжанні. Нягледзячы на тое, што гэтыя механізмы маюць розныя задэклараваныя мэты і прававыя рэжымы, іх аб'ядноўвае павелічэнне аб'ёму інфармацыі, якая дазваляе дзяржаве ідэнтыфікаваць чалавека. Паступовае звужэнне прасторы ананімнасці ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму, па-першае, робіць асабліва ўразлівымі тых, хто знаходзіцца ў групе рызыкі палітычнага пераследу як унутры краіны, так і за яе межамі, а па-другое, стварае ўстойлівую інфраструктуру кантролю, якая можа быць выкарыстана адвольна незалежна ад першапачатковага задэклараваных мэт.

- Усё больш фармалізуецца ціск праз сацыяльныя і эканамічныя правы на людзей, вымушана якія знаходзяцца за мяжой. Да падстаў для пазбаўлення пенсіі за асаблівыя заслугі дададзена новая — пражыванне за мяжой. Такая самастойная падстава ўхіляе нават бачнасць сувязі паміж пазбаўленнем пенсіі і канкрэтным «дзеяннем». Цяпер пакарання заслугоўвае сам факт знаходжання па-за краінай, што ператварае гэтую меру ў інструмент трансгранічных рэпрэсій і ціску на тых, хто з'ехаў і валодае асаблівым уплывам і грамадскім становішчам.

- Пераслед у сувязі з прызнаннем ЕГУ «экстрэмісцкай арганізацыяй», які пачаўся ў чэрвені 2026 г., добра ілюструе на практыцы агульны трэнд «пабочных рэпрэсій» (дапушчальнай пабочнай шкоды падчас рэпрэсій), сфармуляваны намі ў папярэднім аглядзе: імкнучыся зрабіць жыццё «палітычна ненадзейных» яшчэ больш нязручным, дзяржава непасрэдна закранае, пазбаўляе правоў або падвяргае рызыцы рэпрэсій шырокае кола людзей, уключаючы тых, хто не мае ніякага палітычнага профілю. Паводле дадзеных ПЦ «Вясна» па стане на 17 жніўня вядома як мінімум аб 175 пацярпелых ад такога пераследу (110 студэнтаў і іх сваякі) і як мінімум аб 60 вобысках. Да людзей прыходзяць па факце навучання ў ЕГУ, а таксама па факце аплаты за вучобу.

- У кантэксце практычна татальнага утойвання дзяржавай інфармацыі, на падставе якой можна рабіць вывады аб аб'ёме і інтэнсіўнасці палітычнага пераследу, асабліва відавочным становіцца крызіс традыцыйных метадаў маніторынгу. Гэта, у сваю чаргу, уплывае на тое, які аб'ём інфармацыі атрымлівае міжнародная супольнасць і на якой аснове фарміруецца ўяўленне аб тым, што адбываецца ў Беларусі. У чэрвені 2026 г. ПЦ «Вясна» падрыхтаваў даклад «Схаваныя рэпрэсіі» з аналізам таго, як мяняўся характар прамых форм пераследу і даступнасць інфармацыі аб гэтым з 2020 па 2026 г.

- Сярод новых практык пераследу можна вылучыць: загад распранацца пры праходжанні мяжы; першыя выпадкі прымянення артыкула 19.4 КаАП аб «прапагандзе ЛГБТК» — нагадаем, БХК рабіў падрабязны аналіз гэтай навацыі; ціск праз КДБ на студэнтаў, якія вучацца ў Польшчы або афармляюць дакументы для выезду на навучанне; актывізацыя спроб супрацоўнікаў КДБ выйсці на прамы кантакт з беларусамі, якія жывуць за мяжой, праз іх сваякоў, якія жывуць у Беларусі.

# І. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ

ГАЛОЎНАЕ:

- новыя правілы рэгістрацыі двух форм арганізацый грамадзянскай супольнасці: прыватных устаноў і асацыяцый (уласнікі ўстановы і чальцы асацыяцыі цяпер мусяць праходзіць узгадненне з КДБ);
- новыя інструменты дысцыплінарнага і ідэалагічнага кантролю як над дарослымі, якія працуюць з дзецьмі, так і над самімі дзецьмі;
- новыя пазасудовыя інструменты рэпрэсій: кантроль над сілавікамі і дыпламатамі;
- чарговае закрыццё доступу да лічбавых паслуг і інфармацыі, важнай для адсочвання рэпрэсій.

## ПАШЫРЭННЕ ЛЕГАЛІЗАЦЫІ СІСТЭМНЫХ РЭПРЭСІЙ

### 1. Узмацненне кантролю за супрацоўнікамі сілавых ведамстваў і дыпламатамі

9 ліпеня 2026 г. прыняты Указ прэзідэнта № 230 «Аб пытаннях праходжання ваеннай службы, службы ў ваенізаваных арганізацыях». Ён замацоўвае дадатковыя меры кантролю ў дачыненні да шасці катэгорый службовых асоб, звольненых па «дыскрэдытуючых абставінах»: ваеннаслужачыя, супрацоўнікі органаў фінансавых расследаванняў КДК, Следчага камітэта, органаў унутраных спраў, органаў па надзвычайных сітуацыях і дыпламаты. Паказальна, што дыпламатычная служба таксама аднесена да службы «ва ўзброеных або ваенізаваных арганізацыях».

У адпаведнасці з навацыяй, арганізацыі, у якіх магчыма такая служба, мусяць не радзей за адзін раз у паўгадзіны на працягу 5 гадоў маніторыць звесткі аб працаўладкаванні такіх людзей. Звесткі для маніторынгу гэтым арганізацыям

прадастаўляюцца Фондам сацыяльнай аховы насельніцтва. Калі яны выяўляюць працаўладкаванне на кіруючыя пасады ў дзяржаўных і прыватных (!) арганізацыях, яны мусяць паведаміць пра гэта ў мясцовыя выканаўчыя органы «для рэагавання ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі».

Тым жа Указам унесены змены ў шэсць адпаведных палажэнняў, якія вызначаюць парадак праходжання ўзгаданых відаў службы, і вызначаны падставы звальнення, якія будуць лічыцца «дыскрэдытуючымі абставінамі». Для ваенных і сілавых ведамстваў гэтыя падставы прыблізна аднолькавыя. Сярод іх — пазбаўленне званняў (для ваенных), крымінальны пераслед, спыненне/адмова ў допуску да дзяржаўных сакрэтаў і дзяржаўнай тайны (у тым ліку з-за адмовы даць згоду на праверку), службовая невадпаведнасць.

З дыпламатамі сітуацыя некалькі іншая. Для іх «дыскрэдытуючымі абставінамі» звальнення будуць: здзяйсненне праступку, несумяшчальнага са знаходжаннем на дыпламатычнай службе; адкліканне дыпламатычнага работніка ў сувязі з абвяшчэннем яго персонай нон грата ў дзяржаве знаходжання альбо здзяйсненнем ім дзеяння, якое цягне крымінальную або адміністрацыйную адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або дзяржавы знаходжання — а таксама здзяйсненне такога ж дзеяння членам сям'і; парушэнне патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах, а таксама аб парадку абыходжання са службовай інфармацыяй абмежаванага распаўсюджвання, калі гэта апранулася яе раскрыццём або стратай альбо стварыла перадумовы для гэтага. Тое ж датычыцца і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу.

Само па сабе вылучэнне асобных абставін звальнення ў асобную групу не супярэчыць прававой логіцы. Аднак забарона займаць пэўныя пасады (за рэдкім выключэннем) — гэта форма пакарання, якая можа накладацца выключна судом. Указ № 230 стварае сур'ёзныя рызыкі парушэння права на роўны доступ да дзяржаўнай службы, права на працу і прынцыпу недыскрымінацыі — нягледзячы на тое, што гаворка ідзе толькі аб кіруючых пасадах.

**Па-першае**, да «дыскрэдытуючых абставін» звальнення адносіцца вельмі шырокі круг абставін, шэраг з якіх носіць ацэначны характар. Яны не суадносныя па цяжкасці і сур'ёзнасці. У адным шэрагу — крымінальны пераслед, дысцыплінарныя падставы і абставіны, якія не залежаць ад волі чалавека (абвяшчэнне персонай нон грата можа быць люстэркавай рэакцыяй прымаючай дзяржавы).

**Па-другое**, не мае разумнага абгрунтавання пяцігадовы тэрмін кантролю, які таксама прымяняецца аднолькава незалежна ад сур'ёзнасці падставы.

**Па-трэцяе**, абсалютна не ўласцівыя ім функцыі кантролю за працаўладкаваннем ускладаюцца на ваенізаваныя арганізацыі і МЗС, якія такім чынам пачынаюць выконваць функцыі МУС у частцы кантролю за выкананнем пакарання.

**Па-чацвёртае**, кантроль за працаўладкаваннем ажыццяўляецца і ў дачыненні да прыватнага сектара, што наогул выводзіць яго за межы логікі кантролю за дзяржслужбай і з'яўляецца ўмяшаннем як у права на свабоду выбару працы, так і ў прыватны сектар рынку працы.

Такім чынам, Указ замацоўвае пазасудовы механізм абмежавання ў працоўных правах, ускладаючы паслужбовы кантроль за грамадзянскім жыццём на ваенізаваныя арганізацыі.

У кантэксце, які характарызуецца сістэматычным выкарыстаннем звальненняў і абмежаванняў доступу да прафесій як інструмента палітычнай фільтрацыі, гэты механізм патэнцыйна можа выкарыстоўвацца для кадравых чыстак і запалохвання. Гэта перспектыва не проста быць звольненым і сысці з дзяржслужбы, а быць звольненым без магчымасці ўвогуле будаваць кар'еру і свабодна выбіраць месца працы ў адпаведнасці са сваімі прафесійнымі запытамі.

### 2. Узмацненне кантролю за свабодай перамяшчэння грамадзян праз абмежаванне доступу да інфармацыі

Дзяржава працягвае прымаць новыя меры для абмежавання доступу да лічбавых паслуг (насуперак задэклараванаму трэнду на лічбавізацыю) і інфармацыі. 20 ліпеня 2026 г. прыняты Указ прэзідэнта «Аб банку даных аб грамадзянах Рэспублікі Беларусь, права на выезд якіх з Рэспублікі Беларусь часова абмежавана». Ім зменены парадак прадастаўлення звестак з банка даных аб грамадзянах, якім часова абмежавалі выезд з Беларусі. Калі раней такія звесткі можна было атрымаць анлайн праз асабісты кабінет у сістэме МУС, то цяпер яны прадастаўляюцца толькі асабіста – грамадзяніну або яго законнаму прадстаўніку (у апошнім выпадку, акрамя ўласнага дакумента, трэба прадаставіць дакумент, які пацвярджае асобу таго, аб кім запытваюцца звесткі). Адпаведна, пасля гэтага з сайта МУС знікла функцыя анлайн-праверкі забароны на выезд.

**Па-першае**, гэта чарговы выпадак закрыцця доступу да інфармацыі, важнай у кантэксце рэпрэсій – гэтак жа, як і закрыццё ў 2025 г. доступу да анлайн-расклада судовых паседжанняў.

**Па-другое**, такая мера зніжае даступнасць і аператыўнасць атрымання інфармацыі аб тым, ці падпадае чалавек пад забарону на выезд, што неабходна для

эфектыўнай абароны свайго права на выезд. Калі дзяржава тэхнічна здольная прадаставіць чалавеку інфармацыю дыстанцыйна, узнікае лагічнае пытанне: чаму для атрымання інфармацыі аб уласным статусе грамадзяніна цяпер патрабуецца яго асабістая прысутнасць?

У рэпрэсіўным кантэксце для чалавека, які асцерагаецца адвольнага палітычнага пераследу і хоча загадзя даведацца, ці ёсць у яго забарона на выезд — менавіта для таго, каб мець поўную карціну свайго становішча і быць у стане прыняць нейкія меры — сам факт неабходнасці асабістага звароту ў МУС можа несці дадатковую рызыку і, адпаведна, стрымліваючы эфект.

**Па-трэцяе**, гэта таксама форма трансгранічных рэпрэсій, паколькі вымушана з'ехаўшыя або прымусова вывезеныя людзі не могуць атрымаць інфармацыю аб сваім статусе — напрыклад, выпадак вывезенага ў снежні 2025 г. праваабаронцы Уладзіміра Лабковіча.

### 3. Узмацненне кантролю за грамадзянскай супольнасцю

За май–жнівень 2026 г. прыняты або прапанаваны ў якасці праектаў шэраг норм, якія закручваюць чарговы віток жорсткага кантролю за грамадзянскай супольнасцю.

**Па-першае**, 1 чэрвеня 2026 г. прыняты новы закон «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) юрыдычных асоб». Ён уступае ў сілу з 1 ліпеня 2027 г. Новы закон упершыню ўводзіць асобае фармалізаванае правіла аб узгадненні для:

- дзяржаўнай рэгістрацыі прыватнай установы, асацыяцыі (саюза);
- змен, якія ўносяцца ў статут прыватнай установы і звязаных са зменай уласніка маёмасці прыватнай установы.

Рэгіструючы орган цяпер мусіць накіроўваць запыт «у дзяржаўны орган, упаўнаважаны на ажыццяўленне мер па папярэджанні і выяўленні пагроз нацыянальнай бяспецы» на прадмет таго, ці ствараюць дзейнасць уласніка маёмасці прыватнай установы або чальца асацыяцыі, якія падалі дакументы на рэгістрацыю, пагрозу нацыянальнай бяспецы. Станоўчы адказ такога органа з'яўляецца падставай для адмовы ў рэгістрацыі (арт. 25–26). Закон не называе такі орган прама, аднак асноўным органам, адказным за забеспячэнне нацыянальнай бяспекі ў Беларусі, з'яўляецца КДБ.

Працей кажучы, цяпер людзі, якія, на думку КДБ, «ўяўляюць пагрозу бяспецы», не змогуць зарэгістраваць юрыдычную асобу ў форме прыватнай установы і асацыяцыі (саюза). У апошнім выпадку праверцы падлягаюць усе чальцы. Для параўнання: папярэдні акт, які рэгулюе гэтыя пытанні, прадугледжваў для ўстаноў і асацыяцый праверку пераважна фармальнага характару, у тым ліку пацверджанне таго, што ўласнік маёмасці ўстановы або яе кіраўнік не стаіць на прафілактычным уліку ў адпаведнасці з заканадаўствам аб прафілактыцы правапарушэнняў.

Lawtrend падкрэслівае, што ўводзіцца дадатковы крытэрый ацэнкі, які звязаны не з адпаведнасцю дакументаў устаноўленым патрабаванням, а з ацэнкай абставін, якія адносяцца да пагроз нацыянальнай бяспецы. Пры гэтым закон не раскрывае зместу адпаведных абставін, крытэрыяў іх ацэнкі, парадку праверкі такой інфармацыі і працэсуальных гарантый яе аспрэчвання.

Важна адзначыць, што менавіта гэтыя формы арганізацый грамадзянскай супольнасці — прыватная ўстанова і асацыяцыя — традыцыйна былі формамі з упрошчанай рэгістрацыяй, блізкай да заяўніцкага парадку, у параўнанні з іншымі формамі: грамадскім аб'яднаннем, прафсаюзам, фондам і палітычнай партыяй.

Адпаведна, новая норма фармалізуе і так практычна неабмежаваную фактычную магчымасць КДБ кантраляваць арганізацыі грамадзянскай супольнасці. Такая фармалізацыя сістэматызуе рэпрэсіі, прыбірае нават фармальныя магчымасці пазбегнуць такога кантролю (гэта значыць цяпер КДБ заканадаўча абавязаны рабіць тое, што раней было магчымай практыкай). Такім чынам, дзяржава нібы «затыкае дзіркі» ў рэпрэсіўнай сістэме і знішчае нават фармальна наяўную магчымасць змясціць арганізацыю грамадзянскай супольнасці ў легальнае поле ў Беларусі, калі тая не з'яўляецца бездакорна лаяльнай дзяржаве.

Падрабязны аналіз Lawtrend апісвае і іншыя новыя абмежаванні.

**Па-другое**, падрыхтаваны праект закона «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці прафесійных саюзаў». На сайце Міністэрства юстыцыі адзначаецца, што ў праекце комплексна ўрэгуляваныя пытанні, якія датычацца правоў прафсаюзаў у розных галінах, прынцыпаў іх дзейнасці, узаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі, а таксама замацаваны палажэнні аб стварэнні і дзейнасці прафсаюзаў, іх прадстаўніцтве і паўнамоцтвах па абароне правоў працоўных грамадзян, гарантыях чальцоў прафсаюзаў.

**Па-трэцяе**, рыхтуецца канцэпцыя закона аб валанцёрскай дзейнасці. Па словах чыноўнікаў, закон будзе размяжоўваць паняцці «валанцёр» і «дабраволец».

Таксама ў новым законе хочуць адмовіцца ад неабходнасці стварэння адзінай базы валанцёраў, каб у будучыні не займацца бюракратыяй і фармалізмам, і абяцаюць, што праца валанцёраў не будзе абцяжарвацца і празмерна рэгламентавацца.

У абодвух апошніх выпадках тэксты праектаў пакуль не даступны, таму немагчыма каментаваць канкрэтныя палажэнні. Аднак, улічваючы нядаўнюю практыку змены заканадаўства аб грамадскіх аб'яднаннях, палітычных партыях, рэлігійных арганізацыях, якая прывяла да неабходнасці іх перарэгістрацыі, адзначым агульную тэндэнцыю фармалізацыі пераводу ўсіх форм грамадзянскай супольнасці на «ручное кіраванне» і дзяржаўны кантроль. Мяркуючы, што два новыя законы таксама накіраваны на гэта,тым не менш будзем рабіць падрабязны аналіз пасля публікацыі тэкстаў.

## ЦІСК У СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

### 1. Узмацненне ідэалагічнага кантролю за індывідуальнай адукацыйнай дзейнасцю (нефармальная адукацыя)

У траўні 2026 г. на грамадскае абмеркаванне вынесены праект Пастановы Савета Міністраў «Аб рэестры фізічных асоб, якія ажыццяўляюць самастойную прафесійную дзейнасць па навучанні дзяцей». Прапануецца стварыць дзяржаўны рэестр фізічных асоб, якія ажыццяўляюць самастойную прафесійную дзейнасць па навучанні дзяцей (датычыцца толькі аказання паслуг непаўналетнім). Гэта азначае, што легальна займацца рэпетытарствам і прыватным навучаннем зможа толькі чалавек, уключаны ў гэты рэестр — па сутнасці, адобраны дзяржавай.

Фізічная асоба, якая хадайнічае аб уключэнні ў рэестр, не павінна мець абмежаванняў на працу з дзецьмі ў адпаведнасці з арт. 27-1 Закона аб правах дзіцяці. Пры гэтым у ліпені 2025 г. у Закон аб правах дзіцяці былі ўнесены змены, якія дадаюць у стандартны пералік складаў, пры наяўнасці судзімасці па якіх чалавек не можа займаць педагагічную пасаду, — «злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці». Гэта прадугледжвае вельмі шырокі круг складаў і пералік дзеянняў, якія актыўна выкарыстоўваюцца ўладамі для адвольнага праследу па палітычных матывах. Дэпартамент кантролю якасці адукацыі Міністэрства адукацыі, які будзе весці рэестр, абавязаны будзе запытаць звесткі аб кожным кандыдаце ў МУС.

Паказальна, што згодна з праектам меркуецца, што супрацоўнік дэпартамента, адказны за вядзенне рэестра, аднаасобна будзе прымаць рашэнне — аб уключэнні чалавека ў рэестр або адмове — на падставе атрыманых звестак.

Чалавек, уключаны ў рэестр, абавязаны паведаміць Дэпартаменту аб узнікненні ў яго абмежаванняў на працу з дзецьмі не пазней за тры працоўныя дні з моманту іх узнікнення. Рэестр меркуецца зрабіць публічным. Працэдура абскарджання адмовы ва ўключэнні ў рэестр або выключэння з яго не прадугледжана.

У абгрунтаванні да праекта ўказваецца, што яго мэты — абарона непаўналетніх і сістэматызацыя інфармацыі аб людзях, якія аказваюць такія паслугі. Пры гэтым адзначаецца, што такі рэестр дазволіць агарадзіць дзяцей ад паслуг людзей, асуджаных па пераліку артыкулаў, названых у арт. 27-1 Закона аб правах дзіцяці, уключаючы «злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці».

Такім чынам, дзяржава планамерна рухаецца да татальнай манапалізацыі адукацыі: за апошнія 5 гадоў цалкам знішчана прыватная фармальная адукацыя (закрыты амаль усе прыватныя школы і дзіцячыя садкі), уведзена забарона на анлайн-навучанне ў замежных школах для дзяцей, якія пражываюць у Беларусі (гл. наш аналіз за травень–жнівень 2025 г.). Цяпер дзяржава рухаецца да ўстанаўлення поўнага кантролю над індывідуальнай адукацыйнай дзейнасцю. У сакавіку 2025 г. (гл. аналіз за студзень–красавік 2025 г.) на абмеркаванне было вынесена яшчэ адно Пастанова Савета Міністраў, якое істотна і неабгрунтавана абмяжоўвае ў правах самазанятых, якія працуюць у сферы адукацыі (рэпетытарства, гурткі, студыі). Прапанаваны рэестр яшчэ больш дыскрымінуе і пазасудова абмяжоўвае ў свабодзе выбару працы чалавека, які мог быць асуджаны па палітычных матывах.

### 2. Пашырэнне паўнамоцтваў па правядзенні агляду непаўналетніх ва ўстановах адукацыі

У чэрвені 2026 г. была апублікавана Пастанова Савета Міністраў № 307 «Аб ажыццяўленні аховы дзейнасці». Яна пачне дзейнічаць з 1 верасня. Сярод іншага яна ўносіць змены ў правілы агляду (асабістага, рэчаў, дакументаў) непаўналетніх. Раней непаўналетніх можна было аглядаць толькі ў прысутнасці бацькоў або законных прадстаўнікоў. Цяпер з гэтай нормы ёсць выключэнне: агляд дапускаецца ва ўстанове адукацыі ў прысутнасці педагагічнага работніка.

Па словах начальніка Дэпартамента аховы МУС, прынящце дадзенай нормы прадыктавана вывучэннем замежнага вопыту. Ён падкрэслівае, што абноўлены парадак не азначае, што ўсіх дзяцей перад уваходам у школу будуць аглядаць: «Мы выдатна ведаем, на каго з вучняў трэба звярнуць асаблівую ўвагу, атрымліваем гэтую інфармацыю ад педагогаў і супрацоўнікаў інспекцыі па справах непаўналетніх».

Сама па сабе магчымасць агляду школьнай аховай можа быць адэкватнай мерай забеспячэння бяспекі ў шэрагу выпадкаў, аднак гэта не можа разглядацца апрыёры як норма. Такія змены ў дачыненні да дзяцей ствараюць умовы для адвольнага ўмяшання ў іх права на асабістую недатыкальнасць і прыватнае жыццё, прыніжэння іх годнасці і дыскрымінацыйнага стаўлення.

Па-першае, педагог не з'яўляецца законным прадстаўніком дзіцяці. Яго прысутнасць забяспечвае наяўнасць іншага дарослага, але не абавязкова незалежную абарону інтарэсаў дзіцяці. Асабліва ўлічваючы цяперашні ідэалагічны кантроль за педагогамі і кантроль педагогаў за дзецьмі, тлумачэнні прадстаўніка МУС аб тым, што яны атрымліваюць ад педагогаў інфармацыю аб тым, на каго з дзяцей варта звярнуць увагу, гучаць вельмі двухсэнсоўна. Такім чынам, дзяржава свядома ставіць дзіця ў загадзя ўразлівае становішча. Гэта відавочна супярэчыць прынцыпу ўліку найлепшых інтарэсаў дзіцяці — цэнтральнага прынцыпу ў стандарце абароны правоў дзяцей.

Узнікае пытанне аб працэсуальных гарантыях дзіцяці пры ўмяшанні дзяржавы. Чаму для дасягнення мэт бяспекі абавязкова трэба пазбаўляць дзіця гарантыі прысутнасці бацькі?

Па-другое, сітуацыю пагаршаюць вельмі размытыя падставы для агляду. Гаворка ідзе не толькі аб неабходнасці знайсці стандартныя забароненыя прадметы — тое, што нельга выносіць або прыносіць у школу. Гаворка ідзе і аб «рэчах, якія з'яўляюцца прыладай або непасрэдным аб'ектам супрацьпраўных замахаў, а таксама адпаведных дакументах». Улічваючы «экстрэмісцкае заканадаўства», да такіх можа адносіцца шэраг рэчаў асабістага карыстання.

Такім чынам, агляд становіцца не мерай бяспекі, а чарговым інструментам дысцыплінарнага і ідэалагічнага кантролю над дзецьмі.

## ПАШЫРЭННЕ МАГЧЫМАСЦЯЎ АДВОЛЬНАГА ДОСТУПУ ДЗЯРЖАВЫ ДА ПЕРСАНАЛЬНЫХ ДАНЫХ / УМЯШАННЕ Ў ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ

У апошнія некалькі гадоў няспынна пашыраецца заканадаўства, якое стварае механізмы ўмяшання дзяржавы ў права на недатыкальнасць прыватнага жыцця. З'яўляюцца дадатковыя магчымасці для палітычна матываванага пераследу. Гэта праяўляецца ў двух аспектах: па-першае, прамое прадастаўленне сілавым

органам неабмежаванага доступу да цэлага шэрагу крыніц асабістай інфармацыі. Па-другое, меры, якія прама не звязаны з прадастаўленнем доступу сілавым органам, але самі па сабе не адпавядаюць стандарту правоў чалавека і таму ствараюць патэнцыяльныя магчымасці для лічбавага сачэння. Фармальна гэта абгрунтоўваецца легітымнымі мэтамі (забеспячэннем бяспекі, барацьбой са злачыннасцю), але па сутнасці прымаемыя нормы і абмежаванні непрапарцыйныя і не забяспечаны неабходнымі працэсуальнымі гарантыямі.

Так, у аналізе за студзень-красавік 2024 г. і травень-жнівень 2025 г. мы разглядалі заканадаўчыя змены ў сферах перавозкі пасажыраў, банкаўскіх аперацый, паштовых адпраўленняў і ў цэлым інфармацыйных рэсурсаў, якія ўтрымліваюць персанальныя даныя, — змены, якія дазваляюць дзяржаве (у тым ліку сілавым органам) мець неабмежаваны, а ў некаторых выпадках аддалены доступ да персанальных даных чалавека і ўмешвацца ў яго прыватнае жыццё без належных працэдурных (судовых) гарантый.

За справаздачны перыяд з'явіліся чарговыя заканадаўчыя навацыі і азвучаныя службовымі асобамі намеры адносна такіх мер.

### 1. Пашырэнне пераліку даных, якія кліент абавязаны прадаставіць банку: геалакацыя цяпер абавязковая

Нацбанк паведамляе, што з 1 ліпеня 2026 г. для беларускіх банкаў уведзены стандарт «Лічбавы адбітак прылады». Стандарт прадугледжвае збор, захоўванне і аналіз лічбавага адбітка прылады, у які ўваходзіць, у прыватнасці, інфармацыя аб месцазнаходжанні прылады. Гэта азначае, што для таго, каб карыстацца паслугамі дыстанцыйнага абслугоўвання, **кліент абавязаны дазволіць банку атрымліваць звесткі аб яго геалакацыі**. Без гэтага будзе немагчыма карыстацца мабільным банкінгам. Нацбанк асобна падкрэслівае, што даныя лічбавага адбітка прылады нікому не перадаюцца і выкарыстоўваюцца выключна ў антыфрод-сістэмах для супрацьдзеяння несанкцыянаваным плацяжам. Барацьба з махлярствам — безумоўна легітымная мэта абмежаванняў і ўмяшання ў прыватнае жыццё. Аднак тут узнікае некалькі пытанняў.

**Па-першае**, безальтэрнатыўнасць меры. Калі чалавек не прадасць сваю геалакацыю, ён не зможа дыстанцыйна кіраваць сваімі грашыма. У еўрапейскай практыцы прадастаўленне геалакацыі можа быць адной з опцый і толькі дадатковым фактарам абароны. Акрамя таго, у якасці ідэнтыфікуючага фактара выкарыстоўваецца сама прылада — адсюль узнікае пытанне суразмернасці такой меры і меркаванняў бяспекі.

**Па-другое**, калі ўлічваць беларускі рэпрэсіўны кантэкст і практыку неабмежаванага доступу сілавых органаў да розных масіваў даных, а таксама выкарыстанне лічбавых слядоў у рэпрэсіўных мэтах, то банкаўскія даныя становяцца дадатковай крыніцай інфармацыі аб перамяшчэннях чалавека і могуць быць выкарыстаны для яго пераследу.

Агучаныя Нацбанкам гарантыі аб непрадастаўленні даных трэцім асобам, на жаль, не маюць сілы ў беларускіх рэаліях. Цяжка ўявіць сітуацыю, калі банк адмаўляецца прадаставіць інфармацыю па запыце сілавых ведамстваў.

Безумоўна, такая навацыя сама па сабе не азначае аўтаматычнага адсочвання, але стварае сітуацыю дадатковай уразлівасці і «бачнасці» чалавека для дзяржавы. І асабліва ўразлівыя людзі, якія знаходзяцца ў групе рызыкі ў сілу палітычна матываванага пераследу — як унутры Беларусі, так і за мяжой (пры карыстанні картамі беларускіх банкаў).

### 2. Анансаваны закон аб абавязковай рэгістрацыі ДНК

Камітэт дзяржаўных экспертыз Беларусі ініцыюе закон аб абавязковай геномнай рэгістрацыі грамадзян. Па сцверджанні старшыні КДЭ пытанне знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі. Відавочна, што пакуль няма тэксту праекта, складана казаць аб адпаведнасці або неадпаведнасці прапанаваных навацый стандарту правоў чалавека.

Аднак важна адзначыць, што такая заява аб нарматворчай ініцыятыве карэлюе з пэўнай неправавой практыкай сілавых ведамстваў у гэтай сферы. У жніўні 2025 г. стала вядома, што ў Магілёўскай вобласці супрацоўнікі сілавых органаў збіраюць генетычны матэрыял (сліну) сваякоў людзей, якія з'ехалі з Беларусі. Па словах праваабаронцаў, якія прадаставілі журналістам гэтую інфармацыю, супрацоўнікі РАУС сказалі, што фарміруецца база даных ДНК, каб у выпадку неабходнасці людзей за мяжой «можна было апазнаць». Паводле звестак праваабаронцаў, ДНК-матэрыял збіраюць як у сваякоў з'ехаўшых (у тым ліку журналістаў), так і ў асуджаных па палітычных абвінавачваннях. Такая практыка мае месца ў розных гарадах Беларусі і працягваецца з 2024 г. Цалкам незразумела, на якой падставе, па якім прынцыпе і навошта збіраецца гэты генетычны матэрыял.

Нагадаем, што згодна са стандартамі правоў чалавека, у тым ліку практыкай ЕСПЧ, дзяржава мае права ствараць і выкарыстоўваць рэестры ДНК для папярэджання і расследавання злачынстваў. Пры гэтым прымусовы збор і захоўванне генетычных даных уяўляе сабой сур'ёзнае ўмяшанне ў права на прыватнае жыццё, таму яны мусяць адпавядаць патрабаванням законнасці, неабходнасці і прапарцыйнасці.

У адпаведнасці з падыходам ЕСПЧ асноўнымі праблемамі з'яўляюцца: усеагульны або недыферэнцыраваны характар рэгістрацыі, адсутнасць сувязі паміж рэгістрацыяй і канкрэтным злачынствам, празмерныя або неабмежаваныя тэрміны захоўвання, адсутнасць эфектыўнай працэдуры выдалення даных і недастатковыя гарантыі супраць доступу і выкарыстання інфармацыі ў іншых мэтах.

У беларускім кантэксце гэтыя рызыкі дадаткова ўзмацняюцца адсутнасцю эфектыўных незалежных механізмаў кантролю за дзейнасцю праваахоўных органаў і наўмысным выкарыстаннем заканадаўства для фармалізацыі палітычна матываванага крымінальнага пераследу. Таму ўся кампанія дзяржавы па зборы і захоўванні ДНК у першую чаргу мусіць ацэньвацца з пункту гледжання наступных крытэрыяў: круг асоб, якія падлягаюць рэгістрацыі, падставы і парадак адбору, тэрміны захоўвання, магчымасці выдалення і межы доступу да базы.

У гэтым кантэксце нельга не адзначыць заканадаўчыя змены, прынятыя ў лютым 2026 г. адносна збору біяметрычнай інфармацыі (мы аналізавалі гэта на стадыі праекта ў выпуску за верасень–снежань 2025 г.). Істотна пашыраны круг грамадзян, якія падлягаюць абавязковай дактыласкапіі. У тым ліку цяпер туды ўваходзяць замежныя грамадзяне, якія праходзяць памежны кантроль, беларусы, якія пастаянна пражываюць за мяжой, а таксама тыя, хто атрымаў «від на жыхарства або іншы дакумент замежнай дзяржавы, які прадастаўляе права на льготы і іншыя перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю» — гэта значыць пераважна ў сілу палітычнага пераследу. Пры гэтым азвучаны намер адносна такіх змен мы адзначалі ў выпуску за верасень–снежань 2024 г. Адпаведна, праект закона аб геномнай рэгістрацыі можна чакаць прыблізна праз год.

У цэлым гэтая тэндэнцыя сведчыць аб пашырэнні выкарыстання розных сістэм ідэнтыфікацыі і адсочвання чалавека, што ў кантэксце рэпрэсіўнага механізму аўтарытарнай дзяржавы азначае пашырэнне магчымасцяў ціску і пераследу.

## САЦЫЯЛЬНЫЯ І ЭКАНАМІЧНЫЯ ПРАВЫ: АБМЕЖАВАННІ І СФЕРЫ ПЕНСІЙНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ЯК ЧАСТКА РЭПРЭСІЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

У чэрвені 2026 г. унесены змены ў Палажэнне аб пенсіях за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь. Падставы пазбаўлення пенсіі дапоўнены наступным — пастаяннае пражыванне за межамі Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым цікава прасачыць эвалюцыю змены гэтых падстаў пасля 2020 г.

У 2021 г. да такіх падстаў былі дададзены «злачынствы, дзеянні, якія наносяць шкоду дзяржаўным інтарэсам, нацыянальнай бяспецы». Пры гэтым у дзеючай рэдакцыі гэтая падстава гучыць як «устанаўленне фактаў здзяйснення… (незалежна ад прыцягнення да крымінальнай або адміністрацыйнай адказнасці)». Гэта значыць падставай з'яўляецца не вынік законнай працэдуры прызнання чалавека вінаватым, а толькі суб'ектыўная ацэнка фактаў. Пры гэтым за апошнія 5 гадоў да «дзеянняў, якія наносяць шкоду дзяржаўным інтарэсам, нацыянальнай бяспецы» заканадаўча аднесены шэраг дзеянняў, за якія людзей тыпова пераследуюць па палітычных матывах. У 2023 г. падставы былі дапоўнены яшчэ больш ацэначнай і палітычна матываванай фармулёўкай — «непавага да дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь».

Такім чынам, свежыя змены адносна пражываючых за мяжой цалкам выразна дапаўняюць відавочны трэнд фармалізацыі выключэння з кола асоб, якія маюць права на асаблівую пенсію, палітычна нелаяльных. Акрамя гэтага, апошнія змены робяць свой унёсак у корпус неправавых нормаў заканадаўства, якія пазбаўляюць правоў вымушана з'ехаўшых беларусаў, дадаючы падстаў для трансгранічных рэпрэсій.

# II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ГРАМАДЗЯНСКІЯ, ПАЛІТЫЧНЫЯ, САЦЫЯЛЬНЫЯ, ЭКАНАМІЧНЫЯ І КУЛЬТУРНЫЯ ПРАВЫ

ГАЛОЎНАЕ:

- узмацняецца латэнтны характар рэпрэсій, што карэлюе з крызісам метадаў маніторынгу;
- актывізаваліся спробы КДБ выйсці на прамы кантакт з беларусамі, якія жывуць за мяжой, праз іх сваякоў, якія жывуць у Беларусі.

## МАСАВЫ ПЕРАСЛЕД ЗА СУВЯЗІ З ЕГУ

У красавіку 2026 г. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт быў прызнаны «экстрэмісцкай арганізацыяй». У папярэднім выпуску (студзень–красавік 2026 г.) мы адзначалі, што гэта першы выпадак з наступствамі такога маштабу: сам факт наяўнасці дыплома ЕГУ (уключаючы ўсіх выпускнікоў любых праграм), а таксама любая публічная сувязь з ЕГУ, уключаючы гасцявыя публічныя лекцыі або сустрэчы працадаўцаў са студэнтамі ў рамках кірмашоў вакансій, можа стаць падставай для пераследу.

Практыка пераследу аказалася сапраўды шырокай, інтэнсіўнай і дастаткова жорсткай. Вобыскі і допыты пачаліся з 2 чэрвеня. Паводле даных ПЦ «Вясна» па стане на 17 жніўня вядома як мінімум аб 175 пацярпелых ад такога ціску (110 студэнтаў і іх сваякі) і як мінімум аб 60 вобысках. Да людзей прыходзяць па факце навучання ў ЕГУ, а таксама па факце аплаты за вучобу. Таксама КДБ прыходзіць да выпускнікоў ЕГУ. Фігуруюць два крымінальныя артыкулы — «садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці» і «фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці». Сілавікі патрабуюць ад бацькоў дзеючых студэнтаў звязвацца з дзецьмі і патрабаваць адлічэння; студэнтам пагражаюць затрыманнем бацькоў.

Такая карціна пераследу добра ілюструе агульны трэнд **«пабочных рэпрэсій»** (дапушчальнай пабочнай шкоды падчас рэпрэсій), сфармуляваны намі ў папярэднім аглядзе: імкнучыся зрабіць жыццё «палітычна ненадзейных» яшчэ больш нязручным, прымаемыя меры непасрэдна закранаюць, пазбаўляюць

правоў або падвяргаюць рызыцы рэпрэсій шырокае кола людзей, уключаючы тых, хто не мае ніякага палітычнага профілю

## «СХАВАНЫЯ РЭПРЭСІІ»

Усё больш узмацняецца латэнтны характар рэпрэсій. З гэтым карэлюе крызіс метадаў маніторынгу, звязаны з наўмысным утойваннем дзяржавай вялікай колькасці інфармацыі аб крымінальным і адміністрацыйным пераследзе. У чэрвені 2026 г. ПЦ «Вясна» падрыхтаваў даклад «Схаваныя рэпрэсіі» з аналізам таго, як змяняўся характар прамых форм пераследу і даступнасць інфармацыі аб гэтым з 2020 па 2026 г. У дакладзе заяўляецца аб крызісе традыцыйных метадаў маніторынгу і ўплыве гэтага на тое, які аб'ём інфармацыі атрымлівае міжнародная супольнасць і на якой аснове фарміруецца ўяўленне аб тым, што адбываецца ў Беларусі.

## НОВЫЯ ПРАКТЫКІ ПЕРАСЛЕДУ

**Па-першае**, у ліпені стала вядома, што прыблізна з вясны 2026 г. пры праходжанні мяжы з'явілася новая форма ціску: у некаторых выпадках ад тых, у каго ёсць фармальныя сляды прыцягнення да адказнасці па «палітычных падставах», акрамя прагляду тэлефона, патрабуюць распрануцца.

**Па-другое**, праваабаронцы (ПЦ «Вясна» са спасылкай на «Іншыя») паведамляюць аб першых выпадках прымянення артыкула 19.4 КаАП аб «прапагандзе ЛГБТК». Нагадаем, БХК рабіў падрабязны аналіз гэтай навацыі.

**Па-трэцяе**, у ліпені 2026 г. стала вядома, што студэнтаў, якія вучацца ў Польшчы або афармляюць дакументы для выезду на навучанне, сталі выклікаць на гутаркі ў КДБ — у тым ліку і пасля падачы дакументаў на візу.

Па-чацвёртае, нам вядома, што за справаздачны перыяд асабліва актывізаваліся спробы супрацоўнікаў КДБ выйсці на прамы кантакт з беларусамі, якія жывуць за мяжой, праз іх сваякоў, якія жывуць у Беларусі.

**МЫ БУДЗЕМ УДЗЯЧНЫ ЗА ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ !**

ПІШЫЦЕ НАМ НА OFFICE@BELHELCOM.ORG